ДЗВІНСКІ ЎЗГОРАК

Кроч на свой родны, дзвінскі ўзгорак, каб глядзець у будучую сінь

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ВІЦЕБСКАГА РАЁНА, №20 (125)
СНЕЖАНЬ 2020 ГОДА

ЧАС І ВЕРА

"КАСЦЁЛ БАРОНІЦЬ ГОДНАСЦЬ ЧАЛАВЕКА"

Напярэдадні свята Божага нараджэння біскуп Віцебскі Алег Буткевіч з удзячнасцю згадвае сямейную традыцыю адзначэння гэтай падзеі. У інтэрв'ю «Радыё Рацыя» кіраўнік дыяцэзіі паразважаў і аб тым, ці можа святар выказваць сваю грамадзянскую пазіцыю, ці ягоная задача выключна працаваць у храме.

Упрыгожаная ялінка, сямейная вігілійная вячэра і магчымасць наведаць літургію ў касцёле, нягледзячы на верагодныя праблемы ў школе ці на працы, як тое бывала за савецкім часам, — гэтыя ўспаміны заўсёды саграваюць сэрца.

І таму цяпер, калі многія наракаюць на цяжкія часы, на неспрыяльную сітуацыю ў грамадстве, біскуп Віцебскі Алег Буткевіч раіць не паддавацца скрусе:

— Наракання на час — гэта прыкмета кожнай эпохі, бо няма ідэальнай пары ці ідэальнага часу. Але заўсёды ёсць нагода, каб знайсці штосьці добрае. Калі казаць пра святочную радасць, то гэта таксама пэўны высілак чалавека, каб заўважыць сутнасць таго, што цяпер перажываем, каб у сабе адкрыць прысутнасць не толькі цяжкасцяў і бедаў, але і таго дабра, якое прыносіць і дае чалавеку Бог. І для верніка заўсёднай крыніцай радасці з'яўляецца вера. Яна дае разуменне, што не толькі хлеб надзённы з'яўляецца мэтай жыцця, але і мэты духоўныя.

2020 год адзначыўся высокай грамадзянскай актыўнасцю пасля мінулых прэзідэнцкіх выбараў:

— Мы ведаем, што за грамадскія выступы шмат людзей пакаралі штрафамі, арыштамі і нават турэмнымі зняволеннямі. Сярод іх — пробашч парафіі святога Язафата Кунцэвіча ў Расонах ксёндз Вячаслаў Барок, які нядаўна адбыў 10-суткавы арышт за нібыта прапаганду нацысцкай сімволікі ў сацыяльных сетках. За пікетаванне — за парушэнне адміністрацыйнага артыкула 23.34 — былі затрыманыя віцебскія святары: ксёндз Віктар Жук і грэка-каталіцкі святар Аляксей Варанко.

Падчас абмеркаванняў такіх навін у людзей часам паўстаюць пытанні, ці можа святар выказваць сваю грамадзянскую пазіцыю, ці ягоная задача выключна працаваць у храме, з паствай. Разважаючы над гэтым, біскуп Алег Буткевіч зазначае:

— Тое, што святар павінен працаваць у храме, павінен працаваць з паствай — гэта бясспрэчна. З іншага боку, святар застаецца грамадзянінам сваёй краіны. І ён нязменна застаецца прадстаўніком Касцёла, а Касцёл заўсёды бароніць годнасць чалавека, бароніць ягонае жыццё. Робіць гэта ў шырэйшым, глабальным сэнсе. І выказванні святароў на гэтую тэму — гэта іх абавязак звяртаць увагу на недасканаласці ў нашым грамадстве. Безумоўна, трэба зважаць на тое, што Касцёл — гэта не палітычная партыя, ён не можа выступаць як палітычная сіла. Але ён заўсёды на абароне правоў чалавека, ягонай годнасці і ягонага жыцця.

У сваіх калядных пажаданнях біскуп Алег Буткевіч яшчэ раз падкрэсліве значнасць духоўнасці і веры як падмуркаў дасягнення справядлівасці і свабоды. І зычыць беларусам здароўя, поспехаў і Божага благаслаўлення.

«Радыё Рацыя»

Чытайце сайт Віцебскага раёна: http://vicebskreg.by

КРЫМІНАЛЬНЫ ПЕРАСЛЕД

ДВА ГАДЫ ПАЗБАЎЛЕННЯ ВОЛІ

16 снежня ў судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску агучылі прысуд у дачыненні да 27-гадовага мастака Уладзіслава Макавецкага. Віцяблянін прызнаны вінаватым ва ўчыненні злачынства, прадугледжанага арт. 364 КК («Гвалт або пагроза ўжывання гвалту ў дачыненні супрацоўніка ўнутраных спраў»). Суддзя Сняжана Кіндзеева прызначыла пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на два гады.

Як адзначаецца ў прысудзе, Уладзіслаў Макавецкі прызнаны вінаватым «у гвалце і пагрозе ўжывання гвалту да супрацоўніка МУС, перашкодзе законнай дзейнасці, прымусу да змены характару гэтай дзейнасці».

Інцыдэнт, інкрымінаваны Уладзіславу Макавецкаму, адбыўся падчас пратэставаганшэсцяўраёнеВуліцыПраўды ў Віцебску 6 верасня. Макавецкі нібыта меў намер нанесці нагамі і рукамі ўдары супрацоўніку МУС Фядотаву і замахваўся падабранай з зямлі гумавай палкай на малодшага сяржанта Пятроўскага. На прадэманстраваным у судзе відэа абвінавачанні, высунутыя супраць Макавецкага, свайго бясспрэчнага пацверджання не знайшлі, але, як паказаў вырак, суд узяў пад увагу аргументы, агучаныя пракурорам Філіпенкам. Той пераконваў, што «міліцыянты не атрымалі пашкоджанняў цела толькі дзякуючы сваім прафесійным якасцям».

Суддзя Сняжана Кіндзеева прызнала Макавецкага вінаватым і пастанавіла пакараць яго пазбаўленнем волі тэрмінам на два гады з адбыццём пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму.

Вынесены прысуд выклікаў адмоўную рэакцыю ў грамадзянаў, якія прыйшлі падтрымаць Уладзіслава Макавецкага. На погляд слухачоў, такі вырак неадэкватна суровы.

«Уладзіслаў кінуўся па дапамогу чалавеку, якога збівалі міліцыянты. Гэта натуральная рэакцыя нармальнага грамадзяніна, якому не ўсё адно, які надзелены пачуццём салідарнасці. Супрацоўнікі МУС не панеслі ніякага пакарання, а Уладзіславу толькі «за пагрозу ўжывання гвалту» – 2 гады. Гэта вельмі вялікі тэрмін, і, як мінімум, несправядлівы. Калі б я быў там, я быў бы на ягоным месцы», – падзяліўся меркаваннем адзін са слухачоў на працэсе, які назваўся Уладзіславам.

«Пасля вынесенага прысуду ўзнікае ўражанне, што суддзямі ў нас прызначаюць людзей бяздушных, бесчалавечных, нават жорсткіх. Як мяркуюць прысутныя, ніякага злачынства Макавецкі не ўчыняў. Максімум – адміністрацыйнае правапарушэнне. Працэс паказаў: як дакрануўся да супрацоўніка МУС – дык ужыў гвалт. І табе – два гады пазбаўлення волі. А калі супрацоўнікі міліцыі з канвойнай роты сёння выганялі людзей з судовай залы, хапаючы іх рукамі, толькі што не казалі «шнэль-шнэль», то гэта нармальна. Ім можна прымяняць гвалт да грамадзянаў, і ім за гэта нічога не будзе. Гэтыя парушэнні правоў чалавека бачылі прадстаўнікі суду, але яны не спынілі незаконных дзеянняў, а наадварот спрыялі ім. А навошта такое стаўленне да абвінавачанага? Прысуд яшчэ не ўступіў у законную сілу, а яго трымаюць у клетцы за кратамі, вядуць у кайданках. Няўжо ён асабліва небяспечны злачынца?» – сказаў пасля суду праваабаронца Павел Левінаў.

Ян Сведка

ІНІЦЫЯТЫВА

У БІЛЕВА СПЫНЯЦЬ ВЫСЕЧКУ ЛЕСА?

Жыхары Віцебска дамагаліся, каб каля Білева спынілі секчы лес. Чым усё скончылася?

Жыхары Віцебска запатрабавалі спыніць высякаць лес побач з мікраёнам Білева. Інспекцыя аховы жывёльнага і расліннага свету стала на іх бок.

Два тыдні таму мясцовыя жыхары накіравалі ў розныя інстанцыі лісты, у якіх патрабавалі растлумачыць, навошта высякаюць ўчастак лесу на ўскраіне Віцебска, дзе любяць адпачываць гараджане.

Адказ абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету апублікаваны ў тэлеграм-канале «Білева». У ім паведамляецца, што зварот чыноўнікі разгледзелі з выездам на месца.

3 ліста вынікае, што высечку дрэў вядзе Воранаўскае лясніцтва Віцебскага лясгаса - «на падставе лесасечнага білета ад 16 лістапада». На гэтым участку лесу запраектавана рубка перафармаванне: яе ўжываюць для карэннага змянення узроставай структуры, складу ці будынкі дрэвастою.

Пры гэтым інспектары выявілі, што некаторыя елі вызначаны для высечкі неабгрунтавана.

Інспекцыя ўлічыла меркаванне гараджан, а таксама тое, што гэты лес ставіцца да катэгорыі рэкрэацыйна-аздараўленчых і размешчаны побач з горадам. Лясгасу рэкамендаваліануляваць дзеянне лесасечнага білета, прыпыніць рубку і разгледзець пытанне аб ачысткі гэтага ўчастка лесу ад сухастою, ламачча і буралому.

Якаў Дрозд

ПАЛІТЫЧНЫ ПЕРАСЛЕД

АШТРАФАВАЛІ ЗА СЦЯГ НА БАЛКОНЕ

У судзе Полацку і Полацкага раёну 21 снежня на 270 рублёў аштрафавалі прафсаюзнага лідара Віктара Стукава – за тое, што размясцію «палотнішча бел-чырвона-белага колеру» на балконе. Мужчыну затрымалі 17 снежня і пратрымалі ў ІЧУ 72 гадзіны, абвінавацюўшы ў правядзенні адзіночнага пікетавання (ч.1 арт. 23.34 КаАП).

Пастанову аб пакаранні штрафам на 10 базавых велічынь вынес суддзя Віктар Баліка. Ён палічыў, што Віктар Стукаў сапраўды учыніў правапарушэнне, вывесіўшы, як запісана ў пастанове, каляровае палотнішча «з мэтай публічнага выказвання сваіх грамадска-палітычных інтарэсаў».

Стукаў сваёй віны не прызнаў: «Юрыдычна я нічога не парушыў, вывесіўшы палотнішча для прасушкі на вяроўкі балкона. Больш за тое! Калі прыняць версію суду, што гэткім чынам я выказваў нейкія свае погляды – дык тады атрымліваецца, што гэта чыноўнікі міліцыі і суду парушылі маё права на свабоднае выказванне свайго меркавання, што гарантуе мне арт. 33 Канстытуцыі».

Але больш за ўсё Віктара Стукава абурыла яго адвольнае затрыманне на трое сутак. Палачаніна затрымалі проста на пешаходным пераходзе – на той падставе, што ён калісьці і дзесьці пераходзіў дарогу ў неўстаноўленым месцы. Аднак у Полацкім РАУСе маёр

(працяг на стар. 2)

ПАЛІТЫЧНЫ ПЕРАСЛЕД

(пачатак на стар. 1) міліцыі Ігар Емяльянаў склаў на Стукава пратакол паводле арт. 23.34 – за «незаконны пікет на балконе».

«Як мне сказалі ў міліцыі, рашэнне аб размяшчэнні мяне ў ІЧУ да суду прыняў дзяжурны па РАУСе, хоць у гэтым не было ніякай неабходнасці, бо я мог проста з'явіцца ў суд па позве. Я папярэдзіў дзяжурнага, што ён такім чынам перашкодзіць дзейнасці прафсаюзу. У мяне былі набытыя на пятніцу 18 снежня электронныя квіткі да Менску і назад для ўдзелу ў пасяджэнні Рады Свабоднага прафсаюзу Беларускага (СПБ)», – расказаў Віктар Стукаў.

Наконт умоваў утрымання ў ізалятары Віктар Стукаў канстатуе прагрэс у параўнанні з тым, што назіралася ў ІЧУ ў 2017-м годзе. Пасля шматлікіх скаргаў у 2018 годзе там правялі капітальны рамонт. Стукаў расказвае, што камеру №1 пашырылі, цяпер яна на 8 чалавек, стаяць двух'ярусныя ложкі, з'явілася рукамыйніца, часам у ёй ёсць нават цёплая вада, з'явілася кабінка з дзверцамі ў прыбіральні. У камеры, па словах Віктара, стала цяплей. Харчаванне прывозяць з гарадской сталовай, часам яго недастаткова, але перыядычна даюць кіпень.

"Віцебская Вясна"

МІЛІЦЭЙСКІ ПЕРАСЛЕД

СПРАВУ ЛІЦЭІСТКІ СПЫНІЛІ

21 снежня суд Першамайскага раёну Віцебску вынес рашэнне па адміністрацыйнай справе ў дачыненні да студэнткі першага курсу Віцебскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага ліцэю Марыі Амасовіч, абвінавачанай паводле арт. 23.34 КаАП. Суддзя Міхаіл Юрчанка справу спыніў і прынёс прабачэнні за дзеянні міліцыі.

6 снежня 19-гадовая Марыя Амасовіч выйшла па хлеб у краму, але неўзабаве была затрыманая непадалёку ад свайго студэнцкага інтэрнату і крамы «Віталюр». Падставай для затрымання сталі два балонікі ў форме сэрца белага і чырвонага колеру, якія ёй падарыла дачка яе знаёмай за пару хвілін да гэтага. Міліцыянты палічылі, што дзяўчына выказвала свае грамадска-палітычныя погляды.

18 снежня прайшло першае судовае паседжанне. Марыя Амасовіч не адмаўляла, што ішла па вуліцы з шарыкамі. Але цалкам не разумела, чаму яе затрымалі. Міліцыянты Марозаў і Каліснічэнка, якія затрымлівалі Амасовіч, настойвалі, што дзяўчына нібыта прыпынілася на некалькі хвілінаў і сваімі дзеяннямі прыцягвала да сябе ўвагу мінакоў і кіроўцаў. Гэткім чынам яна быццам бы і «выказвала свае грамадска-палітычныя інтарэсы». Каб разабрацца, суддзя Міхаіл Юрчанка запатрабаваў на тым паседжанні запісы з камераў відэаназірання крамы «Віталюр», «Белтэлекаму» і гасцініцы «Лучоса».

Судовае паседжанне 21 снежня пачалося з таго, што Марыя Амасовіч выказала хадайніцтва аб спыненні судовага працэсу ў сувязі з адсутнасцю ў яе дзеяннях складу правапарушэння. Пісьмовае хадайніцтва далучылі да справы.

У ходзе судовага разбору быў апытаны супрацоўнік Першамайскага РАУС кіроўца Юркоў. Ён пацвердзіў, што Амасовіч, якая рухалася па праспекце Чарняхоўскага, была затрыманая пасля таго, як збочыла з ходнікаў праспекту да свайго інтэрнату. Перад тым, як дзяўчыну затрымалі, яна ўвесь час знаходзілася ў полі зроку кіроўцы і ён не бачыў, каб яна спынялася.

Суддзя Юрчанка апытаў таксама і міліцыянтку патрульна-паставой службы Першамайскага раёну Юлію Аскеру, якая праводзіла асабісты дагляд Марыі Амасовіч пасл затрымання. Супрацоўніца МУС пацвердзіла, што затрыманая мела пры сабе два надзьмутыя балонікі белага і чырвонага колеру. У кішэні знаходзіліся яшчэ тры шарыкі – два чырвонага і адзін белага колеру.

Удзельнікі працэсу прагледзелі відэа, узятае з камераў відэаназірання крамы «Віталюр». Відэа не пацвердзіла той факт, што Амасовіч спынялася на ходніках, каб звярнуць на сябе ўвагу.

Агучваючы матэрыялы справы, Міхаіл Юрчанка, між іншым, адзначыў, што Марыя Амасовіч за апошнія месяцы пяць разоў прыцягвалася да адміністрацыйнай адказнасці за ўдзел у масавых мерапрыемствах паводле арт. 23.34 КаАП.

Вывучыўшы доказы, якія меліся ў справе, суддзя Міхаіл Юрчанка пастанавіў справу ў дачыненні да Марыі Амасовіч «спыніць у сувязі з недаказанасцю яе віны ва ўчыненні адміністрацыйнага правапарушэння».

Ад імя суду Міхаіл Юрчанка прынёс Марыі Амасовіч прабачэнне за дзеянні супрацоўнікаў МУС.

Якаў Дрозд

АДМІНІСТРАЦЫЙНЫ ПЕРАСЛЕД

БАРЫС ХАМАЙДА ВЫКАЗВАЎ БЕЛАРУСКІ ІНТАРЭС

24 снежня суд Чыгуначнага раёну Віцебску аштрафаваў найстарэйшага віцебскага апазіцыянера Барыса Хамайду на 50 базавых велічыняў. Суддзя Вольга Шапавал прызнала яго вінаватым ва ўдзеле ў не дазволеным уладамі пікетаванні. Дзеянні актывіста былі кваліфікаваныя паводле ч. 3 арт.23.34 КаАП.

Барыс Хамайда не адказаў на пытанне пра давер да складу суду, але патлумачыў Вользе Шапавал, што пасля 1996 году ніводзін з сённяшніх суддзяў не мае законных паўнамоцтваў, бо ўсе яны прызначаныя нелегітымным кіраўніком.

Паводле пратаколу, складзенага супрацоўнікам Чыгуначнага РАУС, Барыс Хамайда 9 снежня каля дому №30 па вуліцы Леніна «ўзяў актыўны ўдзел у несанкцыянаваным пікетаванні». Размясціў там плакат з лозунгам «Жыве Беларусь!», улётку з друкаваным тэкстам «Ты пераможаш!» і стужкі бела-чырвонага колеру. На думку міліцыянтаў, сваімі дзеяннямі Хамайда парушыў парадак арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў.

Барыс Хамайда звярнуў увагу суду на тое, што першапачаткова быў іншы пратакол, у якім былі яшчэ пазначаныя БЧБ-сцяжок і малітва-вышыванка «Ойча наш». Замену пратаколу суддзя ніяк не патлумачыла.

Асаблівае абурэнне ў актывіста выклікаў той факт, што міліцыянты ў яго забралі два тэлефоны, а ўмовай вяртання назвалі выплату штрафу.

«З малітвай-вышыванкай і расцяжкай, якая заканчваецца словамі «Жыве Беларусь», я стаю апошнія сем гадоў. А з бел-чырвона-белай стужкай адстаяў дзесьці гадоў чатырнаццаць. Калі яны лічаць гэта пікетам, то ён занадта доўга працягваўся. Сем і чатырнаццаць гадоў. А ўвогуле ўжо дваццаць чацвёрты год. І яны толькі цяпер уздумалі пісаць пратакол?..» – абурыўся Хамайда.

3 пратаколам актывіст не пагадзіўся, віны сваёй не прызнаў, ад дачы паказанняў адмовіўся, бо свае дзеянні пікетам не лічыць.

«Я паказваю, што я жыву ў Беларусі, што тут жывуць беларусы, што тут ёсць гісторыя, што бел-чырвона-белы сцяг – сцяг гістарычны… І з боку маралі, і з боку законнасці – усё нармальна. Я лічу, што гэтак выказваў нацыянальны, беларускі інтарэс, а грамадскі ён ці палітычны, вызначайце самі», – сказаў Барыс Хамайда.

Пасля агучвання матэрыялаў справы суддзя Вольга Шапавал прызначыла Барысу Хамайду штраф у памеры адной тысячы трохсот пяцідзесяці рублёў (50 базавых велічыняў).

Суд доўжыўся 20 хвілінаў.

Ян Сведка

ШТРАФ ЗА ПАРТРЭТ ЛУКАШЭНКІ З «3%»

23 снежня суд Першамайскага раёну Віцебску вынес рашэнне паводле дзвюх справаў, заведзеных на кухарку абласной больніцы Алену Куставу. Маці дваіх няпоўнагадовых дачок прызнаная вінаватай у дробным хуліганстве (арт. 17.1 КаАП) і ў непадпарадкаванні законнаму патрабаванню супрацоўніка МУС (арт. 23.4 КаАП). Суддзя Андрэй Шыдлоўскі аштрафаваў жанчыну на 3 і 5 базавых велічынь адпаведна. Суд доўжыўся два дні.

Паводле пратаколу, 23 лістапада Алена Кустава, знаходзячыся ў холе інтэрнату на вуліцы Заречнай, 3 «наўмысна, з хуліганскіх памкненняў» зняла са сцяны партрэт Лукашэнкі, занесла яго ў свой пакой і «выразала» з рамкі. Замест партрэту на падкладцы напісала «3%» і вярнула рамку з надпісам у хол інтэрнату «для ўсеагульнай дэманстрацыі». Паводле міліцыі, сваімі дзеяннямі «парушыла грамадскі парадак, выказала яўную непавагу да грамадства».

3 пратаколам Алена Кустава не згадзілася, віны сваёй не прызнала, хоць ад таго, што зняла партрэт і занесла ў свой пакой, не адмовілася. Жанчына патлумачыла, што зрабіла гэта з крыўды. Паводле жанчыны, штодзень, праходзячы міма партрэту Лукашэнкі, яна ўсведамляла, што яе жыццё і сацыяльны статус залежаць ад гэтага чалавека. А 23 лістапада Кустава святкавала дзень народзінаў.

«Я шмат разоў прасіла загадчыцу інтэрнату прыбраць партрэт Лукашэнкі. Бо пасля выбараў усё грамадства раскалолася. Адны – за Лукашэнку, другія – за Ціханоўскую. Жыць у краіне, працаваць і не мець магчымасці схадзіць нават у кіно – гэта крыўдна», – патлумачыла Кустава.

Жанчына ўдакладніла, што партрэт не «выразала», а «выняла і акуратна згарнула». Напісала «3%», бо менавіта столькі пасля ўсіх выплат застаецца на жыццё ад заробку. Акрамя вартаўніка на вахце нікога не было, таму выказваць непавагу не было да каго. Намеру сарваць дзяржаўны герб, як ёй прыпісваецца ў рапарце, не мела, запэўніла Алена Кустава.

У другім пратаколе, датаваным 24 лістапада, Кустаў выставілі ў віну тое, што, будучы ўжо затрыманай паводле арт. 17.1 КаАП, яна не падпарадкоўвалася законным патрабаванням старшага ўчастковага інспектара па справах няпоўнагадовых маёра міліцыі Чырвонай. Нібыта «на неаднаразовыя патрабаванні інспектара адказала катэгарычнай адмовай, размахвала рукамі, хапала за форменнае абмундзіраванне».

Сваёй віны паводле гэтага пратаколу Кустава таксама не прызнала. Яна патлумачыла, што падзеі адбываліся не ў 12.00, як пазначана ў пратаколе, а пасля 11-ці, бо яе дзеці якраз збіраліся на аўтобус, які адыходзіць у 11.32. Дочкі мусілі ехаць да бабулі, якая мелася адвесці іх у гімназію. Акурат у гэты час зайшлі два супрацоўнікі, якія не назваліся. Па словах Кустаў, дзеці пайшлі на аўтобус, але іх дагнаў оперупаўнаважаны Комлеў, не дазволіў дзецям зайсці ў аўтобус, малыя заплакалі. У гэты момант пад'ехала інспектарка па справах няпоўнагадовых Чырвоная, якая мусіла перадаць дзяцей бабулі. Кустаў жа загадалі апранацца.

Паводле абвінавачанай, у адной з дачок пачалася істэрыка – яна напалохалася. Кустава папрасіла Чырвоную выйсці з пакоя, але тая не дазволіла Кустаў адчыніць дзверы. Хтосьці з жанчын ударыў у дзверы. Міліцыянт Комлеў вырашыў, што паміж імі ўзнік канфлікт і, ужыўшы сілу, змусіў Куставу выйсці з пакоя. Яна была дастаўленая ў пастарунак, а пасля складання пратаколу – у ЦІЗА, дзе правяла суткі.

У судзе былі апытаныя вартаўнічка, якая выклікала міліцыю, і загадчыца інтэрнату. Міліцыянты Комлеў і Чырвоная запэўнівалі суд, што супраць дзяцей сілы не ўжывалі, а дзеянні ў дачыненні да Кустаў тлумачылі яе «агрэсіўнымі паводзінамі».

Адвакат Алены Кустаў прасіў справу ў дачыненні да сваёй падабароннай спыніць, бо сваімі дзеяннямі жанчына не парушала грамадскі парадак. Між іншым заўважыла, што супрацоўніца Чырвоная наагул не мела паўнамоцтваў затрымліваць Куставу і дастаўляць яе ў РАУС.

22 снежня разгляд справы быў завершаны, але суддзя Андрэй Шыдлоўскі так і не вынес рашэння, бо ў міліцэйскіх пратаколах было шмат памылак. Рашэнне агучыў толькі на наступны дзень.

Алену Кустаў прызналі вінаватай па абодвух артыкулах. Суд аштрафаваў яе на 3 базавыя велічыні (81 рубель) паводле арт.17.1 КаАП і на 5 базавых велічынь (135 рублёў) паводле арт. 23.4 КаАП. Агулам – на 8 базавых велічынь (216 рублёў).

Ян Сведка

АБ'ЯВА

Каб атрымліваць кожны нумар газеты "Дзвінскі Ўзгорак" паведаміце рэдакцыі аб гэтым. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то патэлефануйце.

Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты "Дзвінскі Ўзгорак".

Наша газета стала размяшчацца на партале http://kamunikat.org, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць яшчэ да з'яўлення газеты на паперы.

ВЫНІК

БЕЛОРУСЫ ПОВЗРОСЛЕЛИ, ДУБИНКИ ЛУКАШЕНКО НЕ РЕШАЮТ ПРОБЛЕМЫ

Десять лет назад, 19 декабря 2010 года, состоялась знаменитая Площадь. На акцию протеста по итогам президентских выборов вышло, как тогда казалось, море людей — тысяч 25-30. Площадь жестоко разогнали — как хвалился потом Александр Лукашенко, «за семь с половиной минут». И на следующий день недовольный народ высовываться уже не рискнул.



© Getty Images/AFP/S. Gapon

Тогда никто не предвидел, что десять лет спустя на минских улицах будет уже не море, а океан людей — до двухсот тысяч и больше, и что жестокость силовиков только подхлестнет протесты, которые перерастут в первую волну белорусской революции.

За это десятилетие белорусское общество сильно изменилось, повзрослело, в нем сформировался мощный запрос на политические перемены. А вот власть осталась консервативной, заскорузлой, мыслящей в парадигме «царь и подданные». Так что жестокий конфликт был неизбежен, и он продолжается. Несмотря на зашкалившие репрессии, протесты не утихают пятый месяц…

Тихановская аккумулировала надежды на перемены

Может быть, поэтому тогда, в 2010-м, наверху решили сыграть в либерализм, блеснуть перед Европой и зарегистрировали аж девять альтернативных кандидатов — в расчете, что они разорвут голоса протестного электората. И фокус в чем-то удался.

В итоге, положа руку на сердце, не было ощущения, что кто-то из соперников Лукашенко победил (при том что и в 80% за него самого оппозиционно настроенные граждане не верили). Согласно опросу НИСЭПИ даже самые сильные из оппозиционеров набрали тогда негусто: Владимир Некляев — 9,7%, Андрей Санников — 7%.

Сейчас же многие убеждены, что 9 августа 2020 года победила Светлана Тихановская. Во всяком случае, есть серьезные доказательства, что она получила очень много голосов и что выборы были грубо сфальсифицированы.

Нещадно вырубая в минувшей кампании всех более-менее серьезных альтернативных претендентов (Сергей Тихановский, Валерий Цепкало, Виктор Бабарико), власти переиграли сами себя. В итоге протестные голоса феноменально аккумулировала домохозяйка Тихановская.

При этом дало свои плоды моральное общественное давление: на ряде участков бюллетени были подсчитаны честно или относительно честно. И там, как правило, был солидный перевес в пользу Тихановской.

К слову, сейчас власти уже не могут быть уверены в надежности как минимум участковых комиссий. Те, кого в них обычно включают, почувствовали, что за мухлеж с цифрами есть риск ответить уже в обозримом будущем. Это одна из причин, по которым Лукашенко сейчас не хочется затевать референдум и тем более новые выборы.

Страна вползла в застой и загнивание

Итак, за десятилетие баланс сил между режимом и сторонниками перемен серьезно изменился. Почему это произошло?

Одна из причин — в том, что социально-экономическая модель Лукашенко, основанная на советской индустриальной базе и российской подпитке, исчерпала свой ресурс, перестала работать. После выборов 2010 года произошел финансовый обвал (аукнулось печатание пустых денег), в конце 2014 года — еще одна резкая девальвация. Экономика стала стагнировать. Белорусский ВВП в долларах сейчас ниже, чем в 2008 году.

На финише президентской кампании 2010 года Лукашенко слетал к тогдашнему президенту России Дмитрию Медведеву, замирился и получил подарки к выборам. Сейчас Москва явно не хочет вкладываться в материальную поддержку белорусского вождя, утратившего большую долю легитимности и потому ставшего токсичным, неперспективным партнером.

Как бы ни изощрялась официальная статистика, но масса белорусов по своим кошелькам четко видит, что доходы перестали расти — скорее, идет сползание в бедность. Средняя зарплата так и пляшет вокруг пресловутых 500 долларов, а ведь цены выросли и доллар уже далеко не тот.

Белорусы видят, что страна все сильнее отстает от соседей — например, тех же поляков. И шансов догнать при этой власти, которая боится реформ, нет, светит лишь экономическое прозябание.

Поэтому о переменах заговорили даже те, кто раньше составлял ядерный электорат Лукашенко: работяги, пенсионеры (пусть, мол, хоть внуки заживут как люди) и пр.

Не за жратву, а за свободу

И все же по большому счету людей в этом году поднял на протест не материальный интерес. Лозунги белорусской революции четко показывают: люди вышли не за жратву, а за свободу. Они хотят реально избирать власть и не чувствовать себя рабочей скотинкой. Не желают жить, как под оккупацией.

В общем, теперь совсем другое, чем десять лет назад, состояние умов. В нынешнем году мы увидели, сколь далеко продвинулся процесс формиро-вания гражданского общества и политической нации. Среди белорусов сформировались сильные горизонтальные связи, вызрела мощная, порой трогающая до слез солидарность. Люди научились самоорганизовываться. Сторонники перемен вышли из гетто, почувствовали себя большинством.

При этом старая оппозиция толком так и не пришла в себя после разгрома в конце 2010 — начале 2011 годов. Президентские выборы 2015 года оказались совсем блеклыми, партийные лидеры Анатолий Лебедько и Сергей Калякин не смогли собрать по сто тысяч подписей за выдвижение кандидатами.

Да и перед кампанией 2020 года настроения в традиционной оппозиции были де-факто пораженческими. Провалились праймериз правоцентристской коалиции. Ее представители даже не имели намерения всерьез собирать подписи за свое выдвижение: мол, используем кампанию сугубо для агитации.

Но тут возникли и наделали шороху новые фигуры — Бабарико, Цепкало, чета Тихановских. Их появление совпало с вызревшим запросом на свежую, нестандартную альтернативу. Команды новой оппозиции умело, креативно использовали социальные сети, мессенджеры. Заскорузлая власть бездарно проиграла битву в интернете.

В кампании-2020 Лукашенко, чувствуя шаткость своих позиций, сразу сделал ставку на брутальность, оглушающие репрессии. Зверства силовиков 9–12 августа тоже наверняка не были эксцессом исполнителя. Наверху очевидно рассчитывали повторить опыт разгрома Площади-2010, только в еще более жестоком варианте. Хотели сразу подавить волю к сопротивлению.

Однако получился облом. Люди не испугались, а массово возмутились — и грянули протесты революционной силы.

Как показало исследование Белорусской аналитической мастерской (BAW; Варшава), у протестов 2020 года — мощная мотивация. Руководитель BAW Андрей Вардомацкий отмечает: изначальными причинами мобилизации белорусского общества в нынешнем году стали ситуация с COVID-19 и положение дел в экономике, однако доминантной причиной оказалась жестокость силовиков. Причем у противников режима «произошла трансформация страха в гнев».

Вардомацкий также подчеркивает, что между сторонниками власти и сторонниками перемен «существует полная взаимная непереходимость ценностных систем»…

(скарочана)

Александр КЛАСКОВСКИЙ
«БЕЛАПАН»

МЕРКАВАННЕ

ПОЧЕМУ ВЛАСТЬ ЗА ВЫБОР, НО БЕЗ НАРОДА

Когда Лукашенко говорит: «Я буду драться за эту страну. У меня больше, кроме нее, ничего нет», это он говорит не о стране и не о народе — о власти и о себе в этой системе, уверен эксперт Чалый.

Когда любимая всё

Чалый предполагает, что он едва ли не последний так внимательно следит за риторикой официальных лиц:

— Должен сказать им большое человеческое спасибо. Спасибо, что они продолжают говорить. Это дает удивительную возможность получить окно в их мир.

Сегодня это «окно» в мир от главы КГБ Ивана Тертеля.

Этот мир существует ради заговора против Беларуси, уверен Тертель. Говоря про геополитический передел мира, он заявляет: «Казалось бы, нас 9,5 миллиона жителей, нет выхода к морю, небогатая на природные ресурсы, только калийные удобрения и лес. Казалось бы, что к этой маленькой стране? Но мы на разломе интересов Востока и Запада. Польша называет нас своим „подбрюшьем“. Россия нас называет „Смоленские ворота“, прямой выход к Москве. Кто будет контролировать Беларусь, тот будет доминировать в регионе. Если Россия здесь будет доминировать — это будет серьезный удар по Украине. Мы находимся в центре разделения мира».

— И действительно, у нас уже нет ни одной дружеской страны. Разве что Китай — но он скорее безразличен к нам. Россия — это frenemy: то ли друг, то ли враг, причем вынужденный, вроде соседа по коммунальной квартире, — комментирует Чалый.

Аналитик обращает внимание на то, что у всех трех спикеров, пытающихся вдолбить, как сказал Лукашенко, в голову народа свою картину мира, это не выходит — ни у Кочановой, ни у Тертеля, ни у самого Лукашенко.

Он говорит, что есть рабочая гипотеза: нынешнее представление Лукашенко о том, что происходит в мире, это защитная реакция, вытеснение. Это способ справиться с когнитивным диссонансом. Он не может поверить в то, что народ его разлюбил, что «любимая» решила уйти к другому. И начинается обычный набор реакций вроде «ты никого не найдешь лучше меня», «я же к ним съездил, поговорил — они тебя недостойны».

— Правда, чтобы поговорить, пришлось сперва всех посадить, но это не очень важно. Главное — убедиться, что все недостойны «любимой». Важно убедить себя, что это не она решила уйти, это ее кто-то настраивает, ей задурил голову какой-то коварный соблазнитель, пользуясь адскими технологиями. И подружки плохо на любимую влияют. Наговорили всякого про меня, а я не такой — так что давай перевернем страницу, — отмечает Чалый.

А дальше история начинает обрастать деталями. Известно, как отличить вранье от правды: у вранья избыточное количество подробностей. Поэтому нам не просто говорят про некие происки врагов, а появляются бесконечные перехваты информации, заявления спецслужб, нагромождение диких доказательств — лишь бы не признаться себе, что тебя разлюбили.

Имитация ради манипуляции

При этом Лукашенко в собственном представлении — былинный богатырь Святогор, который черпает силы, касаясь земли, продолжает Чалый. И ему не нужны посредники, не нужны партии, консультанты.

— Он общается напрямую с народной стихией, которая его когда-то вознесла на пьедестал. Тогда, в начале его политической карьеры, это реально была волна, была энергия, и тот, кто ее почувствовал, требует такого на постоянной основе. А дальше любви хочется, но ты готов прилагать для этого все меньше усилий. И тогда вокруг появляются консультанты, тогда для создания иллюзии любви тебе требуется специально отобранный народ, который задаст специально подготовленные вопросы и

(працяг на стар. 4)

МЕРКАВАННЕ

(пачатак на стар. №3)
изобразит заранее отрепетированное обожание.

Еще одна ипостась имитации — попытка повторить действия оппонента. Выходят женщины с цветами? А мы женский форум проведем. В итоге рождается шутка о том, как Мисс Беларусь в исполнении власти превращается в игуменью Гавриилу.

Есть масса способов справиться с когнитивным диссонансом, есть — продуктивные, есть — непродуктивные. И путь имитации — непродуктивный. Это вынужденная вещь. При этом Чалый уверен: многие из тех, кто транслирует эту картину мира, сами в нее не верят. Это именно механизм выражения лояльности.

— Чтобы быть у власти сейчас, надо сознательно разделять этот абсурд, выстроенный вокруг человека, пытающегося вытеснить из своего сознания неприятные факты.

Так что упоминание Натальей Кочановой фейкового плана Даллеса, ставшее мемом, — системный элемент, уверен эксперт.

— Одно дело постправда, когда все на грани, и неизвестно, где истина. Вот Тертель цитирует секретный доклад западных спецслужб, где якобы говорится, что Беларусь проявила эффективную политику исходя из экономических возможностей по борьбе с пандемией. Ни подтвердить, ни опровергнуть этот факт мы не можем. Тут смущает не содержание послания, а сам факт ссылки на него. Почему мы должны в качестве авторитетного источника принимать какие-то секретные доклады чужих спецслужб? Мы что, сами не можем оценить, насколько хорошо прошли первую волну? Но с планом Даллеса все однозначно: это фейк.

Ранее мы говорили о том, как власть пытается создать легитимность без реальных выборов, то есть выбирая народ для вручения главе государства скипетра и державы из самих себя, эксперт напоминает российский термин «имитационная демократия», «управляемая демократия».

— Считалось, причем людьми с вполне интеллигентским бэкграундом, что если народу дать выбирать, он выберет что-то не то. Фашистов выберет. Так что лучше выбор за него сделаем мы. Лукашенко сам оговаривался, что выборы проведем, а власть — не отдам. В его понимании это реально разные вещи: у власти иной источник. Власть — это не когда большинство народа выбрало тебя на какой-то короткий срок выражать их интересы. Это то, что берется волей, силой, может, даже насилием, как сейчас, как это было в период референдума 1996 года. Процедуру подсчета нельзя пускать на самотек, она — часть процесса, часть мироустройства, в котором былинный герой лучше знает, как должно быть. То есть представление об общем благе формируется не суммированием представлений отдельных людей об индивидуальном благе, а кто-то один решит это за других, — рассказывает Чалый.

И когда Лукашенко говорит: «Я буду драться за эту страну. У меня больше, кроме нее, ничего нет», это он говорит не о стране и не о народе — о власти и о себе в этой системе, уверен эксперт.

— А если дать народу выбор — может случиться беда, уверен он, и выстраивает систему управляемой демократии, стараясь соблюсти некие приличия. А то поизбирают себе всяких «незнакомых президентов». Зачем, если есть знакомые? — иронизирует Чалый.

Интересно, что многие вертикальщики верят, что и в других странах система власти устроена так же, продолжает аналитик. Просто у тех — пиар лучше, как у той морской свинки, которая людям симпатичнее крысы именно из-за лучшего пиара.

— Тертель так прямо и говорит: «Я считаю, что демократия — это политтехнология». Притом что сам термин «политтехнология» нигде, кроме постсоветского пространства, больше не используется. На Западе под этим понимается совершенно иное — организация избирательного процесса с точки зрения мобилизации людей, распространения информации и т. п. Никто там не пытается промывать мозги, тем более что это невозможно в условиях свободного рынка СМИ, огромного количества экспертов, партий, — отмечает Сергей Чалый.

(сильно сокращено)

TUT.BY

РАССЛЕДАВАННЕ

«23.34. МЫ ЎСЁ ЗАПІСВАЕМ»

312 судзьдзяў — гэта 2846 несправядлівых прысудаў, 706 тысяч рублёў штрафаў і 12 965 дзён арышту.

Аўтары праекту «23.34. Мы ўсё запісваем», створанага для грамадзкага расьсьледаваньня парушэньняў з боку міліцыі, зьвязаных зь мірнымі акцыямі, сабралі ўжо 4426 гісторыяў затрыманых і асуджаных паводле арт. 23.34 КаАП, а таксама выпадкаў гвалту сілавікоў пры затрыманьні.

У абноўленай статыстыцы судоў над удзельнікамі пратэс-таў у Беларусі «А судзьдзі хто?» на сайце 23-34.net сабрана 4368 гісторыяў асуджаных паводле артыкулу 23.34 КаАП «Пару-шэньне парадку арганізацыі або правядзеньня масавых мерапрыемстваў». Усяго:

- прааналізавана 2846 судовых працэсаў,
- у іх фігуравалі імёны 312 судзьдзяў,
- яны агулам прысудзілі 12 965 дзён арышту і 706 237 рублёў штрафаў.

У адпаведнай табліцы можна пабачыць рэйтынг судзьдзяў паводле агульнай колькасьці «сутак» і штрафаў, якія яны прысудзілі. У «топ-5» судзьдзяў, якія прысудзілі найбольш арыштаў і штрафаў:

- Максім Трусевіч (Менск, суд Першамайскага раёну) — вынес 75 пастановаў суду, прысудзіў агулам 601 дзень арышту і 16200 рублёў штрафаў,
- Анастасія Ляйкоўская (Менск, суд Першамайскага раёну) — 47 пастановаў, прысудзіла агулам 227 дзён арышту і 15174 рублёў штрафаў,
- Аляксандар Воўк (Менск, суд Савецкага раёну) — 45 пастановаў, 277 дзён арышту і 12960 рублёў штрафаў,
- Вікторыя Шабуня (Менск, суд Цэнтральнага раёну) — 44 пастановы, 236 дзён арышту і 12420 рублёў штрафаў,
- Вольга Няборская (Менск, суд Кастрычніцкага раёну) — 41 пастанова, 240 дзён арышту і 10071 рубель штрафаў.

Хто часьцей за іншых даваў штрафы і адпраўляў людзей на «суткі», таксама можна пабачыць на сайце праекту «Грамадзянскі кантроль судовай сыстэмы»: тут рэйтынг судзьдзяў, якія сыстэматычна «вылучаюцца» пры вынясеньні прысудаў паводле 23.34 КаАП, і падрабязная статыстыка прысудаў кожнага судзьдзі.

“Радыё Свабода”

ЗВАРОТ

ЦІ ПАДТРЫМЛІВАЕ ХАКЕЙНЫ СВЕТ ГВАЛТ І ГЕНАЦЫД, ЯКІЯ РОБЯЦЦА Ў БЕЛАРУСІ?

Чэмпіянат свету па хакеі павінен быць святам — звяртаецца знакамітая беларуская баскетбалістка Алена Леўчанка да Рэнэ Фазэля: «Але як можна святкаваць, калі беларусы крычаць ад болю?»

Баскетбалістка Алена Леўчанка выступіла з адкрытым зваротам да прэзідэнта Міжнароднай федэрацыі хакея Рэнэ Фазэля.

Я заўсёды ставілася да тытулаў як да выніку сваёй кар'еры, і ніколі не выкарыстала іх, каб вырашаць складаныя пытанні, таму і да вас сёння я хачу звярнуцца проста як беларуска, — гаворыць Алена Леўчанка ў сваім адкрытым лісце. — І хачу звярнуцца да вас не як да ўплывовай і аўтарытэтнай постаці са свету спорту, а, перш за ўсё, як да чалавека, якому, я ўпэўненая, будзе неабыякава пачуць мяне.

Я ведаю, што правядзенне чэмпіянату свету па хакеі ў траўні 2021-га года пад вялікім пытаннем з-за палітычнай сітуацыі ў Беларусі. Але я хацела б сказаць, што ад вашага рашэння будзе залежаць зусім не тое, ці адбудуцца запланаваныя матчы ў Мінску, ці не. Зыходзячы з гэтага рашэння стане зразумела, ці падтрымлівае хакейны свет у вашай асобе гвалт і генацыд, якія робяцца ў Беларусі.

Пандэмія паказала нам, што спорт немагчымы без заўзятараў: ён папросту не мае сэнсу без людзей на трыбунах. Заўзятары — актыўныя грамадзяне любога грамадства. Кожны мае пашпарт, а кожны дарослы можа галасаваць. Таму нельга проста ўзяць і выключыць спартсменаў і сказаць, што мы — па-за палітыкай. Хто мы? І вас, як чыноўніка, і мяне, як спартоўца, — нас проста няма без заўзятараў. Я разумею, што ўсё, чаго вы хочаце — гэта бачыць зноў Мінск такім жа, якім вы яго запомнілі: чыстым, светлым, ціхім. Згуляць турнір і забыцца пра гэта. Але вы не зможаце правесці чэмпіянат і не заўважыць людзей. Беларусы — ёсць. Мы — народ. Мы — нацыя. А Чэмпіянат свету па хакеі — гэта свята. Але як можна святкаваць, калі беларусы крычаць ад болю?

Ні адзін чалавек у 2020-м годзе не мае права забіваць і калечыць іншага проста таму, што ён мацней, і ў яго руках зброю. А калі вы ведаеце пра гэтыя жахлівыя забойствы і катаванні (30 000 беларусаў за апошнія чатыры месяцы прайшлі праз турмы), калі вы ведаеце і нічога не робіце, значыць, вы заахвочваеце гэта, — вы проста стаіце на другім баку дарогі і назіраеце.

Жыццё кожнага чалавека важнае! Правы кожнага чалавека роўныя. І ні ў каго з нас не будзе магчымасці пражыць гэтае жыццё другі раз. Ваша рашэнне будзе вельмі важным, і яно зусім не пра хакей.

У прэсе я чытала, што ў бліжэйшы час вы плануеце асабіста сустрэцца з Аляксандрам Лукашэнкам, каб абмеркаваць усе нюансы чэмпіянату свету. Якіх гарантый вы хочаце? Абяцанні, што людзі перастануць змагацца за свабоду, выходзіць на вуліцы і выказваць сваё меркаванне і нязгоду з тым, што адбываецца?

Я ўпэўненая, што вам забяспечаць бяспечны шпацыр па Менску: выдадуць персанальную ахову, і людзі ў балаклавах будуць дзяжурыць у кожным двары па шляху вашага руху, не дапускаючы ніводнага мінака бліжэй чым на 100 метраў. Для вас могуць перакрыць вуліцы і аўтамабільны рух, вы трапіце ў рэстараны, якія адкрыюць толькі для вас і закрыюць для ўсіх астатніх. Вас не закране той жах, які закрануў мільёны беларусаў. Але я сумняваюся, што такія дзеянні з'яўляюцца нармальнымі для Швейцарыі, грамадзянінам якой вы з'яўляецеся.

Я не здзяйсняла злачынстваў, але была арыштаваная, асуджаная двойчы і адседзела 15 сутак у ізалятары на Акрэсціна: без гарачай вады, без ацяплення, без медыкаментаў, без пасцельнай бялізны, у камеры адключылі сліў каналізацыі. Кароткі шпацыр даводзілася чакаць 5 дзён — і гэта было марай. Такая простая мара: убачыць неба. Я спала на жалезных бэльках. У мяне з'явіліся галаўныя і адзежныя вошы.

Адной з маіх сукамерніц аказалася грамадзянка Швейцарыі. Яе завуць Наталля Хершэ. І цяпер яна асуджаная на 2,5 года за тое, што сарвала балаклаву з байца АМАПа. Але я хачу нагадаць, што супрацоўнік сіл правапарадку павінен гэты парадак выконваць і ахоўваць, а не хаваць свой твар, як рабаўнік банка з дэтэктыўнага фільма.

Ведаеце, Наталля Хершэ вельмі светлая, добрая дзяўчына. Яна ўмее любіць. У яе ёсць блізкія і сям'я. І яна не злачынца. Таму я веру, што сустрэцца з Аляксандрам Лукашэнкам вы хочаце толькі для таго, каб яна выйшла на волю як мага хутчэй. Я веру, што сустрэцца з ім вы маюць намер затым толькі, каб асабіста сказаць, што вы супраць гвалту, што катаванням у XXI стагоддзі ў цэнтры Еўропы няма месца, што сусветны хакей ніколі не падтрымае дыктатуру, таму што правы чалавека — гэта самая галоўная каштоўнасць. І што Дзмітрый Баскаў, замяшаны ў смерці Рамана Бандарэнкі, не можа займаць пасаду старшыні Федэрацыі хакея Беларусі і заставацца на волі. Спадзяюся, менавіта гэта і ёсць сапраўдная мэта вашага візіту.

«Сёння кожны беларус, калі выходзіць на вуліцу, не ўпэўнены, вернецца ён дадому ці не. Ведаць на памяць нумар свайго адваката і адрасы ўсіх турмаў становіцца нашым штодзённым абавязкам. У кожнага ёсць хоць бы адзін сябар, знаёмы ці блізкі, які пабыў за кратамі. Спадзяюся, вам ніколі не прыйдзецца даведацца і прачуць нешта падобнае і перажыць той жах, у якім ужо чатыры месяцы жывуць беларусы.

На заканчэнне свайго звароту да вас, я хацела б сказаць, што, калі мы глядзім у люстэрка, то застаемся сам-насам са сваім сумленнем. А калі мы засынаем — у нас няма ніякіх тытулаў, рэгаліяў і званняў. Улада і ўплыў патрэбныя толькі для аднаго — каб мяняць свет да лепшага. Дазвольце нам паважаць вас як чалавека!» — гаворыцца ў лісце баскетбалісткі.

Паводле tribuna

Заснавальнік і рэдактар: Смолікаў Канстанцін Эдуардавіч

Адрас рэдакцыі: г. Віцебск, вул. 1-я Сененская д.5,
Тэл. +375-29-218-98-38, e-mail: kas_vit@tut.by
Газета выдаецца з лютага 2014 г.

Падпісана да друку 28.12.2020 у 16.10
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.